№4(50)/2003

Беларускія Ведамасьці

ВАРШАВА, чэрвень-жнівень, 2003 г.



*Васіль Быкаў.*

## ВАСІЛЬ БЫКАЎ НЕ ЖЫВЕ

Няма больш Васіля Быкава на Беларусі. **22-га чэрвеня** яго ня стала.

Сьмерць непазьбежная. Але людзям нялёгка з гэтым зьмірыцца. Цяжка зьмірыцца са сьмерцю Васіля Быкава. Такое ўражаньне, што памерла беларуская літаратура. Быкаў быў яе абліччам. Ён адлюстраваў і спраўдзіў у вобразах клясічныя пастулаты нацыянальнай літаратуры: „лёсы чалавечыя — лёсы народныя”.

Для мяне вельмі балюча, што Быкаў памёр у цяжкім часе і не ў свабодзе, якую трэба яшчэ вярнуць. Крыўдна, што ён яе ня ўбачыць.

Але спакайнее душа, што адбылося гэта на Бацькаўшчыне. Толькі той, хто яе страціў, як Адам Міцкевіч ці Максім Багдановіч, толькі той можа зразумець, што нават памерці на Радзіме ёсьць шчасьце. Апошняе шчасьце беларуса. Тое, што ўжо ня стала Быкава, яшчэ цяжка ўсьвядоміць. У 80-90-я гады, у час актыўнага змаганьня за незалежнасьць і справядлівасьць, Васіль Уладзімеравіч быў для мяне тым найпершым чалавекам, на якога можна было абаперціся, калі акружала і кусала цябе воўчая зграя. Зь ягоным словам лічыліся ўсе.

Але з другой паловы 90-х гадоў зьявілася атмасфэра і людзі, для якіх анічога няма ў Беларусі сьвятога.

У гэтай атмасфэры было немагчыма дыхаць і жыць вялікаму пісьменьніку, бо ня кожны рашаўся яго бараніць.

Адзіноцтва на Бацькаўшчыне ён зьмяніў на адзіноцтва на Захадзе, дзе яшчэ горай, але ўжо ніхто ня мог яго зьневажаць.

І вось цяпер ён вярнуўся ў сьвятую нашу зямлю. Яна, як душа, як калыска, як вечная любоў. Хай жа будзе яна для яго спагаднай!

*22 чэрвеня 2003 г., Нью-Ёрк* **Зянон ПАЗЬНЯК**

# ВАСІЛЬ УЛАДЗІМЕРАВІЧ БЫКАЎ

***(19.06.1924 — 22.6.2003)***

Калі ўвосень 1988 года Беларусь перажывала адзін з кульмінацыйных момантаў сваёй шматвяковай гісторыі, тысячы, сотні тысячаў людзей шукалі шлях у жыцьці. Утвараўся Беларускі Народны Фронт, беларусы пазбаўляліся ад страху і няпэўнасьці, народ злучаўся ў імкненьні да Праўды і Дабра, Незалежнасьці і Свабоды сваёй Бацькаўшчыны — Беларусі. Пасьля двух стагоддзяў каляніяльнага рабства мы заявілі аб праве на самавызначэньне, на сваю культуру і мову, на годнае існаваньне ў сям'і эўрапейскіх народаў. Гэта быў нялёгкі выбар. Беларусам супрацьстаяла дзікая расейска-камуністычная імпэрыя, упэўненая ў канчатковым зьнішчэньні ўсяго жывога і нацыянальнага на нашай зямлі. Але памыляліся ворагі Беларусі. З намі быў Васіль Быкаў! Палярная зорка на небе Беларусі — Васіль Быкаў сьвятлом сваёй душы даваў упэўненасьць патрыётам Бацькаўшчыны. Ягоны голас, ягоныя словы прагучалі мужна і пранікнёна: *„Сумленьне ва ўсім: у стаўленьні да народа, да гісторыі, да сучаснасьці і да будучыні”.*

Адкуль была тая народная вера ў шчырасьць і слушнасьць пазыцыі Пісьменьніка? Кнігі Васіля Быкава вучылі нас чалавечнасьці і надавалі жыцьцядайнай моцы ў самыя цёмныя дзесяцігоддзі хлусьні і рэакцыі. Рамантычны ўздым канца 80-х, зь якога адрадзілася наша незалежная дзяржава, быў падрыхтаваны творчасьцю беларускага генія. Ягоныя творы былі духоўным апірышчам некалькіх пакаленьняў нашага народа. І калі настала пара выбару, ён быў начале тых, хто абраў Беларусь і супрацьпаставіўся цёмным імпэрскім сілам. Ён быў пасьлядоўным да канца. Сваім аўтарытэтам і сваімі новымі творамі ён працягваў змаганьне за нашу агульную высакародную ідэю — Вольную Беларусь. Васіль Быкаў спазнаў разам з народам перасьлед і зьдзекі ад ворагаў Беларусі, але не зламаўся, не саступіў.

Васіль Быкаў не жыве... Але ён з намі — напісанае застаецца, застаецца ўдзячная народная памяць і веліч сапраўднага мастацтва.

***Сябры Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне”***
***і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ***
*25 чэрвеня 2003 г.*

# СЛОВА РАЗЬВІТАНЬНЯ

Дарагі Васіль Уладзімеравіч! Слова, якое тут прамаўляецца, гаворыцца з далечыні, з-за далёкага акіяна, адкуль не далятае голас. Але Вы можаце чуць мае словы ўдзячнасьці і павагі.

Вы стварылі вялікую літаратуру. Сваёй творчасьцю Вы ўзьнялі высока наш беларускі гонар і пакінулі нам яго вышыню.

У Вашай асобе новае беларускае Адраджэньне мела праўдзівую апору. Вы зрабілі выбар для Беларусі, не азіраючыся на Маскву, не пакідаючы запасных шляхоў. Вы падтрымалі стварэньне Беларускага Народнага Фронту і сталі ў ягоных шэрагах, як Сьцяг. І мы разумелі мэту варожых атак.

Мы нячаста сустракаліся з Вамі нават у бурны час нашай нацыянальнай рэвалюцыі, калі вярнулі незалежнасьць. Але я бачыў і адчуваў спагадную прысутнасьць Вашай асобы ў маім лёсе, бо заўсёды на стромкай дарозе, над прорвай, над тваньню недзе побач, недзе тут — быў Быкаў, на слова якога можна было абаперціся, як на рыцарскае кап'ё.

Дзякуй Вам, дарагі Васіль Уладзімеравіч!

Хай сьняцца Вам сьветлыя сны аб вольнай Беларусі, якой Вы не дачакаліся. Але яна вернецца, стане, будзе, жыцьме ня толькі ў снах.

Мы вернем яе ў сіле і сьветазарнасьці. Верым, так будзе і ня згіне ніводнае слова.

О, сьвятая Беларуская Зямля, прыймі свайго сына навечна!

*25 чэрвеня 2003 г.,* **Зянон ПАЗЬНЯК**
*Нью-Ёрк* ***Старшыня Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне”***

# РАЗВАГІ НА СЬМЕРЦЬ ВАСІЛЯ БЫКАВА

22 чэрвеня на 80-м годзе жыцьця памёр вялікі беларускі пісьменьнік і вялікі беларус Васіль Быкаў.

У беларускай і сусьветнай літаратуры творчасьць Быкава — гэта цэлы накірунак, адкрыцьцё для сьвету. Быкаў вобразна выявіў і псіхалягічна, па-мастацку адлюстраваў лёсы беларусаў і лёс народа на вайне і ў часы бальшавіцкага ліхалецьця. Быкаў узьняў наш народ над усім сьветам, паказаў веліч ягонага духу, ягоную моц і адначасна абазначыў прычыны трагедыі ягонага нацыянальнага існаваньня. Быкаў у сваёй творчай паставе глядзеў на Беларусь (як трапна заўважыў доктар В. Кіпель) па абодва бакі фронту. Таму яго і называлі сумленьнем нацыі.

Быкаў трымаўся вельмі годна. Асабліва калі ў канцы 80-х пачалася наша нацыянальная рэвалюцыя і ён стаў у шэрагі адраджэнцаў. Гэта ўзьняло ягоны вобраз сярод беларусаў і зьбянтэжыла акупантаў ды няшчырых сяброў беларушчыны.


(Фота К. Хрышчановіча)

***Разьвітаньне ў Саюзе пісьменьнікаў.***

Бальшавікі і іхны *„перадавы атрад”* — КГБ — перасьледвалі Быкава, але не змаглі зьнішчыць. Ён, гэтак жа, як некалі Янка Купала, быў для іх не па зубах. Купалу, завабіўшы ў Маскву, яны потым забілі, а Быкаву стварылі невыносныя, хамскія ўмовы на Бацькаўшчыне і вымусілі да эміграцыі.

З часу стварэньня Народнага Фронту ў нас быў супольны шлях. Але мы вельмі бераглі Быкава, ніколі не выстаўлялі яго ў палітыцы, каб не наразіць на зьнявагі нікчэмнасьцяў, на правакацыі агентуры, на фамільярнасьць дурняў. Гэта мы ўсё стараліся браць на сябе. Мы ніколі не забываліся, што Быкаў — вялікі пісьменьнік. Мы ніколі не забываліся пра ягоную павагу і аўтарытэт. Нам дастаткова было, што ён з намі.

І вось яго няма. Няма больш Быкава. На пахаваньне вялікага беларуса 25 чэрвеня прыйшлі тысячы, моц народу. Ягоную труну пакрылі *Беларускім Бел-Чырвона-Белым нацыянальным сьцягам*, яе несьлі на руках над морам людзей.

І цяперака (калі пішацца гэта), праз тыдзень пасьля сьмерці Быкава, ідуць і ідуць людзі няспына на Ўсходнія могілкі ў Менску, каб пакланіцца ягонай магіле.

Сьмерць Быкава вельмі яскрава адлюстравала сітуацыю ў Беларусі. З аднаго боку — ўзрушаны народ, які прышоў правесьці ў апошні шлях свайго вялікага пісьменьніка. З другога — кучка выжылай з розуму антыбеларускай улады, якая адмовілася прыняць удзел у пахаваньні і разьвітацца з Быкавым, бо ненавідзела Беларускі нацыянальны *Бел-Чырвона-Белы Сьцяг*, які тут быў паўсюдна з чорнымі стужкамі. „Улады" ў асобе міністра культуры і генэралаў, убачыўшы беларускія нацыянальныя сьцягі, заявілі, што „яны" пакідаюць жалобнае разьвітаньне. Забралі нават свой афіцыйны катафалк, а Лукашэнка — свой няшчыры вянок. Праўда, назаўтра пасьля пахаваньня гэты вянок з расейскім надпісам „Президент Республики Беларусь А.Лукашенко" зьявіўся ўжо на Ўсходніх могілках і каля яго выставілі варту.

Вось такая фантасмагорыя нядобрых і недалёкіх людзей. Сімптаматычна, што нікчэмныя паводзіны існуючай улады нікога не абурылі. Маўляў, што зь іх возьмеш, самы сябе прынізілі, паказалі сваю сутнасьць і ўзровень.

Цяпер усё стаіць перад вачыма: размовы з Быкавым, ягоная прысутнасьць, агульныя справы.., стварэньне Народнага Фронту ў 1988 годзе, клопат пра Курапаты, зьезды і соймы БНФ, сумесныя паездкі па Беларусі і нарэшце — эміграцыя.

Мы меркавалі з Сяргеем Навумчыкам (які быў найбліжэйшай асобай да сям'і Быкава на эміграцыі), што я прыеду ў Прагу ў сярэдзіне сакавіка (яшчэ перад апэрацыяй Быкава). Не атрымалася. Зацягнулі зь візай. Потым заплянаваныя паездкі ў Вільню, у Нью-Ёрк.

Апошні раз мы размаўлялі з Быкавым па тэлефоне вечарам у чацьвер 5-га чэрвеня перад палажэньнем яго ў Бараўлянскі шпіталь. Голас ягоны быў вельмі сумны, казаў, што апэрацыя ў Празе не дапамагла, робіцца горай.

Толькі калі я паклаў слухаўку, я зразумеў, што Быкаў прыехаў у Менск назаўсёды, ведаючы пра гэта сам.

За тыдзень да сьмерці яму стала лепш, і мы з сябрамі радаваліся паляпшэньню, мелі спадзяваньні.

Беларусы ў Амэрыцы балесна ўспрынялі жалобную вестку. 29-га чэрвеня ў царкве Сьвятое Жыровіцкае Іконы Божае Маці ў Гайленд-Парку адбылася памінальная служба, паніхіда за супакой душы Васіля Быкава. Айцец Вячаслаў Логін сказаў казань перад людзьмі, расказаў пра творчую веліч, жыцьцёвы шлях і пахаваньне вялікага пісьменьніка.

*30 чэрвеня 2003 г., Нью-Ёрк* **Зянон ПАЗЬНЯК**



(Фота: Сеціва)

***Разьвітаньне з Быкавым.***

# ДАБРЫНЯ ВЯЛІКІХ І НЯНАВІСЬЦЬ ШЭРЫХ

Сярод разумных і дурань разумны. Але нікчэмная асоба найлепш відаць на фоне вялікіх асобаў. Таму нікчэмнасьць, як правіла, ненавідзіць лепшых.

Самая бязьлітасная нянавісьць, гэта ёсьць нянавісьць шэрых людзей, бо яна ірацыянальная і толькі шукае лягічнага апраўданьня. Гэта нянавісьць натоўпу, што забіваў каменьнямі прарокаў і нянавісьць Сальеры, што падліваў атруту генію (няхай сабе і выдумка — сюжэт, ды ў ім намёк).

23 чэрвеня я прачытаў у Сеціве вытрымкі са „спачуваньня" вышэйшай службовай асобы ў Беларусі ў сувязі са сьмерцю Васіля Быкава. Спачуваньне напісана на расейскай мове, дзе сказана, што „Васілій" Быкаў „выдатны" пісьменьнік, што „Васілій" Быкаў „не шукаў пракладзеных шляхоў" і што памяць пра „Васілія" Быкава „захаваецца" і г.д.

Такім чынам „Васілій". „А тут ня зьдзек, — адкажуць вам з гатоўнасьцю, — гэта пераклад на „удобный язык". Але наша мова і імя Быкава не дазваляюць такіх маніпуляцыяў. Каму гэта можа быць незразумела? Нават у Маскве такое ня робяць, хоць там усе пішуць на „удобном языке".

Мне чамусьці ўспомніўся пэрсанаж адной з п'есаў Бэрнарда Шоў пра норавы XX-га стагоддзя, сноб-інтэлектуал, пісака і балбатун. Ягоная шэрасьць і прэтэнзіі не пераварвалі Арыстоцеля. Ён адчуваў сябе вялікшым і грэбаваў нават імем Арыстоцеля; інакш не называў вялікага філёсафа, як „Стагірыт" (па назве горада, адкуль паходзіў Арыстоцель). Гэтакім чынам шэрасьць і дурнота хоча прынізіць аўтарытэт.

Шэрасьць прымітыўная. Стараючыся прынізіць лепшых, яна імкнецца ўзвысіць сябе і пачынае маніпуляваць імем вялікага (то „забываецца" ягонае прозьвішча, то перакручвае імя, то ня той націск, то ўдае няведаньне, як завуць і г.д.). Шэрасьць у гэты момант жыве ілюзіяй, быццам сьвет мераецца па ёй (маўляў, калі яна ня ведае, хто такі Арыстоцель, то які там яшчэ Арыстоцель). Шэрасьць спадзяецца, што па-хамску перакруціўшы імя вялікага чалавека, яна зьнішчае ягоную вялікасьць і думае, што людзі будуць ёрнічаць разам з шэрасьцю.

Менавіта ў такіх ілюзіях быў пабудаваны зьвыклы зьняважлівы выступ супраць Быкава вышэйшай службовай асобы Рэспублікі Беларусь на расейскім тэлебачаньні НТВ 20-га ліпеня.

„Быков Василий, который вообще не приемлет тенденции на сближение с Россией..." і г.д. — вось тыповы ўзор гэтага маналёгу. Стыль міліцэйскага пратаколу.

„А спыталі б, — падказвае пытаньне журналісту вышэйшая службовая асоба, — ты (г.зн. ён) вучыўся ў школе па падручніках і творах Быкава, чаму ў цябе зь ім ня склаліся адносіны?"

Тут ужо ўспамінаецца Мікалай Гогаль, ягоны Хлестакоў („... с Пушкиным на дружеской ноге" і г.д.) Сапраўды, маўляў, я — велічэзны, ён — „выдатны", а адносіны ў мяне „зь ім ня склаліся". Прапануецца размова пра двух вялікіх (хоць вялікі толькі адзін). Гэта ўзор ня толькі прымітыўнага ўяўленьня пра дачыненьні, але і прыклад таго, як шэрасьць прыладжваецца да знакамітасьці і хоча зраўняцца.

Неадукаванасьць кіруючай асобы ў Беларусі агульнавядомая (чаго вартае, скажам, будаўніцтва Пэрпэтуум Мобіле), таму ніхто ўжо не зьдзіўляецца, што ў дзяцінстве (як кажа гэтая асоба) яна зачытвалася „вершамі" Васіля Быкава.

Не сьпяшайцеся сьмяяцца. Тут ня проста. Трэба ведаць псіхалёгію гэтага „чытача", выпрацаваную на ўзорах гэбоўскіх уяўленьняў. Гэта той жа мэтад перакручваньня імя, ёрніцтва, сьведамае ўдаваньне няведаньня, хто такі Арыстоцель, апусканьне размовы ўніз, на прымітыўны ўзровень, адкіданьне арэола пашаны. Маўляў, мы ведаем, што народны „пісацель", толькі што ён там пісаў: ці вершы, ці прозу, да вороде бы „стихи". Не пісаў? Што вы гаварыце? А я думал, он паэт. І гэтак далей. Гумар лейтэнантаў.

Сапраўдная матывацыя таго, што часам робіць і кажа кіраўнік выканаўчай улады і адэкватнае разуменьне ягоных учынкаў ведамае толькі вузкім спэцыялістам і тым, хто яго назірае даўно.

Аднак самай фэнамэнальнай рысай гэтага дыягназу паводзінаў ёсьць ня хамства, ня ёрніцтва, не нахабства расперазанага халопства, а хлусьня, вялікая ілжа, стыхійная, як патоп; яна вывяргаецца штодзённа, упэўнена і перакананa, у якую ён сам апантана верыць. (І чым больш хлусіць, тым больш верыць.)

І тыя, хто слухаюць яго першы раз, другі, трэці (а некаторыя і тысячу разоў), ня могуць не ўспрымаць, настолькі даверліва, упэўнена, з дрыжыкамі ў голасе і бляскам у вачах ён ілжэ. Ілжэ, нібы спавядаецца, нібы адчыняе душу, хлусьню гаворыць, як малітву, як на духу, выціскае сьлязу.

Гэта не гульня, не мастацтва, не фальш — гэта праўдзівае выяўленьне натуры. (Як па маіх жыцьцёвых назіраньнях — паранойнае выяўленьне псіхалёгіі нэўрастэніка.)

Я працытую тут сьвежую, толькі што сказаную „прамову веры".

„Саша (гэта да вядучага НТВ Аляксандра Герасімава), я не хачу наладжваць якуюсьці піараўскую кампанію і піар на сьмерці гэтага чалавека. Я дастаткова зрабіў для **Васілія** Уладзіміравіча Быкава да сьмерці. Дастаткова зрабіў — пра гэта нідзе не гаварыў. Я зрабіў яму ўсё жывому, аб чым ён і сям'я мяне прасілі. І, паверце, я спрабаваў зрабіць і выратаваць гэтага чалавека пасьля доўгіх гадоў лячэньня за межамі нашай краіны ў самых слаўных лекараў. Вось калі б ён тады зьвярнуўся да нашых лекараў, **Васілія** Быкаў доўга б яшчэ жыў. Але, на жаль, яго ўжо прывезьлі з Чэхіі, зь Нямеччыны, дзе ён яшчэ? — у Фінляндыі лячыўся, прывезьлі ўжо безнадзейным чалавекам. У гэтай сітуацыі я ўсё рабіў."



(Фота: Сецiва)

***Перад магілай Быкава .***

Калі прааналізаваць гэты сьпіч, то можна заўважыць ягоную прадуманасьць. Хоць акрэсьлена была толькі мэта, астатняе — нібыта спантаны палёт „праўдзівай душы", горкае „адкрыцьцё" набалелага. Але ўсё, што тут сказана пра быццам бы звароты Быкава і пра быццам бы клопаты галоўнай службовай асобы ёсьць няпраўда, выдумка, хлусьня.

У тэлефонных размовах з Васілём Быкавым на эміграцыі, у ліставаньні, пры сустрэчы ў Празе ў 2000 годзе у нас ніколі не заходзіла размова пра вышэйшую службовую асобу. У мяне складвалася ўражаньне, што для Быкава яна проста не існавала, бо зь ёй было ўсё зразумела. У Быкава іншым занята была галава. Ён, здаецца, увогуле ніколі ня бачыў гэтую асобу ў жывым пляне (акрамя як па тэлебачаньні), ніколі зь ёй не гаварыў ніякім спосабам і не пісаў.

У „прамове веры" (іранічны сэнс) вышэйшая службовая асоба робіць выгляд, што прыўзьнімае нібыта заслону „праўды". Але ўсё гэта прыдумана, каб прывабна паказаць сябе.

Тым часам да апошняга прыезду ў Менск Васілю Быкаву (не бяз ведама вышэйшай службовай асобы) зрабілі неверагодную подласьць. Нізасьць гэтага ўчынку шакуе. Хвораму Быкаву прыйшлося гэтую нізасьць пераадольваць ды перажываць і з-за яе застацца ў Менску. Ён плянаваў вярнуцца ў Прагу. Там сябры чэхі і беларусы выстараліся яму рэдкае лякарства (20 тысячаў даляраў адна таблетка). Чалавека, нават сьмяртэльна хворага на рак, яно магло пратрымаць у жыцьці яшчэ год, альбо два.

Але Быкаў ня змог выехаць. Нізасьць яго даканала. „Гэта чалавек, які не прымае тую палітыку, якую сёньня Лукашэнка праводзіць у Беларусі", — кажа на НТВ пра Быкава вышэйшая службовая ўлада, называючы сябе ў трэцяй асобе.

Стала вядома, што за тыдзень да сьмерці Быкава сярод бюракратыі ўлады знайшоўся індывідуум, які пахваліўся: у тым, маўляў, што Быкаў затрымаўся ў Менску, — гэта ягоная, чыноўніка, заслуга.

Васіля Быкава ўскосна зьнішчыў рэжым вышэйшай службовай асобы. Я не падаю тут канкрэтнасьцяў, не раскрываю сутнасьць нізасьці, якую зрабілі Быкаву, бо паабяцаў пра гэта пакуль маўчаць. Праўду скажуць тыя, хто яе добра ведае. Яна ўжо прасочваецца, але ня выяўлена поўнасьцю да гэтага часу, з-за выпадковага зьбегу абставінаў. А можа і з наканаваньня вышэйшай Нябеснай Сілы. Хто ведае.

Нельга дараваць зьдзеку над Быкавым — пісьменьнікам і чалавекам. Васіль Быкаў як асоба — гэта вобраз беларуса. Узгадайма ягоную постаць, успомнім жыцьцёвы шлях, угледзімся ў яго аблічча.

***Зянон ПАЗЬНЯК***

*21 ліпеня 2003 г. Нью-Ёрк*

# ТАЛАКА-ВАНДАЛІЗМ-ТАЛАКА

26 ліпеня больш за 40 фронтаўцаў Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ працавалі ў Курапатах. Усталявалі 44 крыжы на магілах ахвяраў расейска-бальшавіцкага тэрору.

Раніцай 29 ліпеня сябры Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ прыйшлі ў Курапаты і ўбачылі наступствы яшчэ аднаго акту вандалізма. Уначы былі вырваны пастаўленыя падчас апошняй талакі 24 крыжы. Злачынцы сьцінулі крыжы ў лесе.

2 жніўня сябры Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ прыйшлі ў Курапаты на штосуботнюю талаку, аднавілі вырваныя і параскіданыя вандаламі 24 крыжы.

***В. БУЙВАЛ***

# З БОГАМ У ДУШЫ І БЕЛАРУСЯЙ У СЭРЦЫ

9 чэрвеня 2002 г. я са сваімі сябрамі езьдзіў *ў вёску Калодная Столінскага раёну* да помніка паўстанцам ***Кастуся Каліноўскага*** 1863 г. На месцы бою стаіць невялікая стэла з надпісам — „1863". Сам помнік агароджаны ланцугамі.

Мы з сябрамі ўсклалі вянок з надпісам *„Слава героям! Жыве Беларусь!"*. Да нас падыйшла мясцовая жыхарка ***Зінаіда Іванаўна*** — так яна назвалася. Было відаць, што для яе гэтае месца вельмі дарагое. Яна расказала нам, што тут у 1863 г. мясьціўся атрад ***Яна Ванькевіча*** і ***Рамуальда Траўгута***, што яны далі бой расейцам пад Століным і невялікім атрадам разьбілі расейскае войска. Але сілы былі няроўныя, і акупанты пачалі сьцягваць вакол паўстанцаў шчыльнае кола.

11 чэрвеня 1863 года Ян Ванькевіч прыняў рашэньне даць бой і прарвацца скрозь акружэньне малымі групоўкамі. У гэтым баі загінула шмат беларусаў, але шмат хто і ацалеў.

Я даведаўся, што і мае продкі прымалі ўдзел у гэтым баі. Мой прадзед ***Антон Фадзеявіч Вабішчэвіч*** ацалеў і вырваўся з акружэньня, а ягоны бацька (мой прапрадзед) ***Фадзей Вабішчэвіч*** загінуў. Прапрадзед Фадзей і прадзед Антон Фадзеявіч былі заможнымі шляхцічамі, родам з *Плотніцы.* Антон Фадзеявіч вымушаны быў усё кінуць у Плотніцы, бо расейцы яго альбо забілі б, альбо саслалі б у Сібір на катаргу. Ён уцёк *у вёску Дубай*, да сваяка. Тут ён ажаніўся з дачкой самага багатага ў вёсцы селяніна (на іх казалі *Юрчыкі*) і пайшоў да іх у прымы. Меў траіх дзяцей, але жонка памерла пры родах. Праз некаторы час Антон Фадзеявіч узяў замуж ***Кацярыну Астроўскую*** (на іх казалі *Лемешы*) са сваёй роднай вёскі Плотніца. Разам ад першай і другой жонкі дзяцей было 22. Але ў тыя часы лекараў не было, таму шмат дзяцей паўмірала.

Антон Фадзеявіч быў самым заможным і паважаным чалавекам у Дубаі,

меў шмат зямлі, млын, кузьню. За тое, што ён любіў дакладнасьць і патрабаваў ад усіх парадку і справядлівасьці, на яго ў вёсцы казалі „дзяркач". Калі ён памёр, яго пахавалі ў вёсцы каля царквы, у самай галаве царквы. І да гэтага часу сьвятар, калі робіць хросны ход вакол царквы, найперш акрапляе магілу майго прадзеда Антона Фадзеявіча Вабішчэвіча.

Саветы не даравалі майму прадзеду, што быў заможным і добрым гаспадаром, і таму пасьля 2-й Сусьветнай вайны расейцы амаль зьнішчылі Дзеркачоў у Дубаі. Забілі майго дзеда ***Адама Антонавіча Вабішчэвіча*** (сына Антона Фадзеявіча), а ягоных дзяцей — саслалі ў ГУЛАГ. У пустой хаце засталіся непаўнагадовыя сіраты загінулага на фронце зяця і старэнькая ***баба Гандзя***. Выжылі яны цудам, бо уся іхная маёмасьць была канфіскаваная, а ўсе ў вёсцы ставіліся да іх, як да ворагаў народа.

Мы з сябрамі ўважліва слухалі Зінаіду Іванаўну. Яна распавяла, што яшчэ пры саветах крыж стаяў. (За польскімі часамі яго называлі „Крыж Траўгута".) Але потым рабілі дарогу, і Крыж зьнесьлі.

Напачатку 80-х гадоў мінулага стагоддзя дырэктар мясцовай школы ***Міхаіл Міхайлавіч Карсека*** і брат Зінаіды Іванаўны ***Леанід Іванавіч Сазановіч*** паставілі на тым месцы стэлу, але ім не дазволілі нічога іншага напісаць, акрамя „1863". Акрамя таго быў вялікі скандал, дырэктара школы ледзь не зьнялі з працы, але жыхары вёскі заступіліся за яго.

У 90-х гадах (за часы незалежнасьці Беларусі) гэтую стэлу даглядалі дзьве ўнучкі Зінаіды Іванаўны. Прыехалі з КГБ і сказалі дзяўчынкам, што калі яны хочуць паступіць куды-небудзь вучыцца, то да помніка хай не падыходзяць. Пасля сканчэньня школы дзяўчаты зьехалі вучыцца ў інстытут у Маскву.

Мы падзякавалі Зінаіду Іванаўну за яе расповяд, прасьпявалі *гімн „Магутны Божа"* і зьехалі з Калоднага.

У сьнежні 2002 г. мы з маім сябрам ***Ігарам Саракавіком*** былі засуджаныя рэжымам на 10 сутак зьняволеньня за арганізацыю пікета ў падтрымку незалежнасьці Чачэніі. Седзячы ў халоднай камэры, я падзяліўся з сябрам сваёй мараю паставіць крыж у Калодным.Там мы і дамовіліся, што ўсталюем яго разам. Але напачатку вырашылі паставіць крыж на магіле ***Рамана Скірмунта***, якая знаходзіцца *ў вёсцы Парэчча Пінскага раёну*, дзе быў маёнтак Скірмунтаў.

25 Сакавіка, на Дзень Незалежнасьці, мы паставілі там трохмэтровы шасьціканцовы дубовы крыж. Крыж асьвяціў айцец Генрых. Потым *у вёсцы Асавая* айцец Генрых рабіў літургію ў гонар Дня Незалежнасьці. Да гэтага часу гучаць у душы ягоныя словы із пропаведзі; „… ня толькі абвяшчэньне, але і стварэньне Беларускай Народнай Рэспублікі!"


(Фота Я. Шатохіна)

***Ля крыжа .***

Адразу пасьля сьвята мы пачалі працу па падрыхтоўцы да ўзьвядзеньня галоўнага крыжа. Мы вырашылі: крыж павінен быць магутны, 10-мэтровы. Патрэбна было жалеза, а дзе яго ўзяць? І канешне ж, патрэбны былі грошы.

У гэты час у Пінск прыехалі швэды. Яны рабілі вечары паэзіі, на якіх павінны былі спаборнічаць маладыя паэты. Пераможца мусіў паехаць у Швэцыю. (Швэды, як і гнілая лібэральная дэмакратыя, лічаць, што падобнымі конкурсамі і „прызамі" спрыяюць разьвіцьцю дэмакратыі і лепшаму жыцьцю


(Фота Я. Шатохіна)

***Крыж у памяць паўстанцаўў 1863 года.***

ў Беларусі. На „заходнія" мерапрыемствы шмат хто прыходзіць у асноўным, каб задарма паесьці.)

Паслухаць маладых паэтаў я пайшоў, але ад дармавых бутэрбродаў адмовіўся адразу, пабачыўшы, як на іх накінуліся маладыя (і ня толькі маладыя) паэты. Я паспрабаваў паразмаўляць пра крыж, пра дапамогу на яго пабудову з Марыяй Сёдэрбэрг і іншымі швэдамі, але ўбачыў, што для іх наш крыж, усяроўна, што мэтро ў Токіо (швэды ў ім усяроўна ня езьдзяць). Так я і зышоў ні з чым.

Дзіўная рэч, але я адчуў палёгку. „Хай будзе цяжэй, — думалася мне, — але гэта будзе наш Крыж, збудаваны на ўласныя грошы, а не на чые-небудзь."

Пачалася праца. Трэба сказаць, што Божая дапамога адчувалася паўсюдна, як быццам сам Бог стаяў за маімі плячамі. Неўзабаве мне патэлефанавалі з Варшавы і паведамілі, што ў Ломжы можна набыць фігурку Ісуса Хрыста памерам 1 мэтар 20 сантымэтраў на наш крыж. Я атрымаў тэлефон мясцовага сьвятара, да якога трэба было зьвярнуцца, бо ў Беларусі выяву Хрыста такіх памераў знайсьці, на жаль, немагчыма. Я патэлефанаваў у Ломжу. Мне адказалі, што фігурка каштуе прыкладна каля ста даляраў. З выдаткамі на дарогу выходзіла больш 140 даляраў. Грошай не хапала, было сабрана толькі 60 даляраў. Але я паехаў. Усю дарогу я маліўся і прасіў Бога, каб ён мне дапамог. Прыехаўшы, я нават не пасьпеў ні аб чым папрасіць, як мне сказалі, што для нас зробяць абніжку і прададуць за 60 даляраў. Вось як бывае — Божая дапамога.

Я прывёз фігурку ў Пінск. Выява Хрыста падштурхнула нас з новымі сіламі ўзяцца за наш крыж. Вельмі цяжка, няпроста, але мы знайшлі жалеза на крыж. Пайшло больш за 70 мэтраў жалезнага профіля, шмат спатрэбілася электродаў, каб зварыць чатыры профілі ў адзін. Вялікі дзякуй ***Валянціну Семяняку з горада Якаў-Палескі***, які зрабіў гэтую цяжкую працу. У яго проста залатыя рукі.

Але, як кажуць, не драмаў і д'ябал. Засталося вытачыць праменьчыкі на крыж. Стальны разец abламаўся на бронзе. Валянцін са сваім сябрам ужо дараблялі напільнікам.

Нарэшце крыж быў зроблены. Мы з сябрамі вырашылі ўсталяваць яго перад сьвятам абвяшчэньня Дэкларацыі пра Незалежнасьць, 26-га ліпеня 2003 г. Ставілі мы наш крыж у Калодным увесь дзень. З першага разу падняцьць крыж мы ня здолелі. Удалося толькі з другога разу. Дзякуй ***Міколу Калесьнікавічу***. Ён усё разьлічыў, як ставіць такі вялікі крыж. Мы залілі больш куба бэтону ў фундамэнт крыжа і скончылі працу ўвечары, калі ўжо пачынала

цямнецъ. Трэба было бачыць маіх сяброў у той дзень, пакусаных да крыві камарамі і змучаных цяжкай працай, але ўсьцешаных.

23 жніўня айцец Генрых асьвяціў Крыж, а айцец Яўген справіў каля Крыжа Боскую літургію па загінулых у паўстаньні.

* * *

Праца па падрыхтоўцы і ўзьвядзеньні крыжа вялася моўчкі, бяз лішняй гаворкі — сур'ёзную працу трэба весьці сур'ёзна. На ўсталяваньні крыжа ўсяго нас працавала восем чалавек, але шмат хто дапамагаў і грашыма, і па-іншаму. Многіх зь іх я не называю адмыслова.

Мы жывём пад антыбеларускім акупацыйным рэжымам, таму наш вораг не павінен ведаць усіх. Тое паўстаньне, якое пачаў Кастусь Каліноўскі, яшчэ ня скончана, і рана яшчэ пісаць на мэмарыяльных дошках „Слава героям!”. Мы змагаемся, і мы — пераможам! І Бог нам у гэтым дапамагае.

Мы заўсёды памятаем словы-наказ Кастуся: „***Толькі тады зажывеш, беларусе, калі над табой ужо мяскаля ня будзе!***”

***Лявон ВАБІШЧЭВІЧ***

# БАРАЦЬБА З РЭЖЫМАМ ПРАЎНЫМІ МЭТАДАМІ

***(Мэмарандум)***

*22 траўня гэтага году* шэсьць грамадзянаў Беларусі (***Сяргей Папкоў, Кастусь Кашэль, Генадзь Пляшко, Алег Радзюк, Алесь Чахольскі, Уладзімер Юхо***), якія належаць да Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне” і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ, падалі іскавыя заявы ў Вярхоўны Суд Беларусі аб парушэньні іхных чалавечых грамадзянскіх і канстытуцыйных правоў у выніку незаконнага падпісаньня А. Лукашэнкам 8 сьнежня 1999 года Дагавора аб стварэньні саюзнай дзяржавы з Расеяй.

Гэтым дагаворам груба парушаныя фундамэнтальныя артыкулы Канстытуцыі і чалавечыя правы грамадзянаў.

Адказчыкамі паісках грамадзянаў выступаюць А. Лукашэнка, які няпраўна займае пасаду прэзыдэнта Беларусі, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу і Савет Рэспублікі, якія ратыфікавалі незаконную дамову.

Істцы патрабуюць прызнаць, што міжнародны дагавор аб стварэньні саюзнай дзяржавы (незаконна падпісаны 8.12.1999 г.) карэнным чынам зьмяняе ў горшы бок умовы жыцьця істцоў, уціскае і парушае іхныя чалавечыя і канстытуцыйныя правы, пагражае здароўю дзяцей.

Істцы патрабуюць прызнаць міжнародны дагавор аб стварэньні саюзнай дзяржавы (8.12.1999) несапраўдным, паколькі ён супярэчыць Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, прыняты з парушэньнямі арт.**7**, **8** Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і арт. **3** і **16** Закона Рэспублікі Беларусь „Аб прэзыдэнце Рэспублікі Беларусь”.

Істцы патрабуюць ад Вярхоўнага Суду ўстанавіць парушэньні і зьвярнуцца ў Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь з хадайніцтвам прызнаць, што арт. **1** міжнароднага дагавора аб стварэньні саюзнай дзяржавы (8.12.1999) па сваёй сутнасьці не адпавядае палажэньням артыкула **1** Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

Згодна закона істцы маюць права зьвяртацца па пытаньнях парушэньня правоў чалавека, якія ўзьніклі ў выніку парушэньня Канстытуцыі краіны, у Вярхоўны Суд, бо толькі Вярхоўны Суд, разгледзеўшы іскі, мае права зьвярнуцца ў Канстытуцыйны Суд.

Аднак Вярхоўны Суд груба парушыў закон і накіраваў іск ў суд ніжэйшай інстанцыі (які ня мае паўнамоцтваў) з рэзалюцыяй: „для прыняцьця рашэньня аб узбуджэньні справы”.

Суд ніжэйшай інстанцыі (у дадзеным выпадку суд Ленінскага раёна г. Менска) адмовіўся ўзбуджаць справу. Тое ж праштампавалі ўсе іншыя судовыя інстанцыі на касацыйныя скаргі істцоў.

На паўторны зварот у Вярхоўны Суд быў дадзены цалкам не абгрунтаваны законам і неадэкватны адказ.

Такім чынам Вярхоўны Суд парушыў закон, адмовіў грамадзянам ва ўзбуджэньні судовай справы па абароне сваіх чалавечых правоў.

Канстытуцыйны Суд таксама адмовіўся ініцыяваць узбуджэньне судовай справы на просьбу істцоў.

У выніку такой пазыцыі судоў грамадзяне зьвярнуліся з заявамі ў Парляманцкую асамблею АБСЭ і ў Камісію па правах чалавека ААН, дзе паставілі пытаньне абісках.

Рэжым Лукашэнкі прасякнуты зьверху да нізу спэцслужбамі чужой краіны, не абгрунтаваны на законах і праве. Этнацыд супраць беларусаў, ламаньне іхных чалавечых правоў, агрэсіўнае бяспраўе і беззаконьне ёсьць асноўная рыса рэжыму. Барацьба праз суды пачата, каб прымусіць афіцыйныя структуры зьвярнуцца да законных шляхоў, каб весьці зь імі размову на праўным узроўні.

Для падмацаваньня справядлівай пазыцыі створана ініцыятыўная група, якая зьбірае подпісы людзей аб далучэньні да заявы істцоў у якасьці трэціх асобаў. Ужо (на 1 жніўня) далучылася паўтары тысячы чалавек.

Зварот у суд выкліканы рэальнай пагрозай чарговага незаконнага рэфэрэндуму аб прыняцьці так званага „канстытуцыйнага акту”, які адчыніў бы шлях да анэксіі нашай краіны Расеяй.

Незаконны рэфэрэндум па задуме арганізатараў пакліканы „легалізаваць” незаконны дагавор, шляхам зьменаў у Канстытуцыі. Гэта ёсьць форма палітычнай агрэсіі, падрыхтоўка інкарпарацыі Беларусі.

Мы інфармуем беларусаў ва ўсім сьвеце і міжнародную супольнасьць і спадзяёмся на салідарнасьць у нашым змаганьні за справядлівасьць, свабоду і гарантыі незалежнасьці Беларусі.

*1 жніўня 2003 г.* ***Зянон ПАЗЬНЯК***

***Старшыня Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне”***

# ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ ДЛЯ ДРУКУ

**1**. Менскі гарадзкі суд (услед за Вярхоўным судом і судом Ленінскага раёна г.Менска) незаконна адмаўляе грамадзянам ва ўзбуджэньні грамадзянскай справы па абароне іхных правоў, парушаных незаконным дагаворам аб стварэньні саюзнай дзяржавы, які А. Лукашэнка падпісаў 8 сьнежня 1999 г.

Калегія Менскага гарадзкога суда пры старшынстве суддзі **Дулуб** 10 ліпеня 2003 г. і Калегія гэтага суда пры старшынстве суддзі **Глухоўскай** 17 і 21 ліпеня 2003 г. разгледзелі касацыйныя скаргі сяброў Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ ***Сяргея Папкова***, ***Генадзя Пляшко***, ***Алега Радзюка***, ***Алеся Чахольскага*** і ***Ўладзімера Юхо***. Калегіі гарадзкога суда праштампавалі адмоўнае рашэньне. У парушэньне норм Грамадзянскага кодэксу і Грамадзянскага працэсуальнага кодэксу яны пацьвердзілі вызначэньне суда Ленінскага раёна аб непадведамаснасьці судом справы парушэньня А. Лукашэнкам і ворганамі ўлады правоў і свабод грамадзянаў. Суды стаяць у глухой абароне А. Лукашэнкі і органаў яго рэжыма. Яны ня ёсьць самастойныя, яны залежныя ад А. Лукашэнкі і рэжыму.

**2**. У падтрымку судовых іскаў сяброў Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ у абарону канстытуцыйных правоў грамадзянаў краіны створана ініцыятыўная група і разгорнута праца па зборы подпісаў пад калектыўнай заявай у Вярхоўны суд. Гэтая ініцыятыва мае агульнаграмадзянскі характар і накіравана на адстойваньне незалежнасьці і сувэрэнітэту Беларусі. Ініцыятары зьвярнуліся да грамадзянаў Беларусі з заклікам байкатаваць незаконны рэфэрэндум, які рыхтуе А. Лукашэнка і Масква. Гэты „рэфэрэндум” ёсьць імкненьне зацьвердзіць незаконную змову аб стварэньні незаконнай саюзнай дзяржавы. Зварот прыкладаецца.

**3**. Паколькі суды ў нашай краіне адмаўляюць грамадзянам ў абароне іхных правоў, ініцыятары падалі пэтыцыі ў Камісію па правах чалавека Арганізацыі Аб'еднаных Нацыяў і АБСЭ. Пэтыцыі накіраваныя па электроннай пошце. 16 ліпеня пэтыцыя ў АБСЭ перададзена афіцыйна намесьніку кіраўніка офіса АБСЭ ў Менску.

*24 ліпеня 2003 г.*

***Прэс-служба Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ***

# ЗАЯВА ІСТЦОЎ

*(Бюро АБСЭ па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека Al. Ujazdowskie, 19, 00-557 Warsaw, Poland)*

Лічым неправільным, што эўрапейская супольнасьць дзяржаваў спакойна назірае за тым, як пасьлядоўна агрэсіўная Расея паглынае Беларусь, парушаючы нашу Канстытуцыю і нормы міжнароднага права, зацьверджаныя Статутам Арганізацыі Аб'еднаных Нацыяў і шэрагам Дэклярацыяў, у тым ліку:

— *„**Дэклярацыяй аб недапушчальнасьці ўмяшальніцтва ва ўнутраныя справы дзяржаваў, аб ахове іх незалежнасьці і сувэрэнітэту**"*, прынятай 22 сьнежня 1965 года, A/RES 2131 (XX);
— *„**Дэклярацыяй аб прынцыпах міжнароднага права, якія тычацца сяброўскіх адносінаў і супрацоўніцтва паміж дзяржавамі ў адпаведнасьці са Статутам Арганізацыі Аб'еднаных Нацыяў**"*, прынятай 24 кастрычніка 1970 года, A/RES 2625 (XXV);
— *„**Дэклярацыяй аб умацаваньні міжнароднай бясьпекі**"*, прынятай 16 сьнежня 1970 года, A/RES 2734 (XXV);
— *„**Дэклярацыяй аб недапушчальнасьці інтэрвэнцыі і ўмяшальніцтва ва ўнутраныя справы дзяржаваў**"*, прынятай 9 сьнежня 1981 года, A/RES 36/103;
— *„**Манільскай дэклярацыяй аб мірным вырашэньні міжнародных спрэчак**"*, прынятай 15 лістапада 1982 года, A/RES 37/10;
— *„**Дэклярацыяй аб прадухіленьні і ліквідацыі спрэчак і сітуацыяў, якія могуць пагражаць міжнароднаму міру і бясьпецы, і аб ролі Арганізацыі Аб'еднаных Нацыяў у гэтай галіне**"*, прынятай 5 сьнежня 1988 года, A/RES 43/51.

Мы, грамадзяне Беларусі: Кастусь Кашэль, Сяргей Папкоў, Генадзь Пляшко, Алесь Радзюк, Алесь Чахольскі, Уладзімер Юхо, падалі іскавыя заявы ў Вярхоўны суд аб парушэньні нашых чалавечых правоў з патрабаваньнем спыніць гвалт над нашымі канстытуцыйнымі правамі, прызнаць несапраўдным дагавор аб стварэньні саюзнай дзяржавы. Адказчыкамі па нашыхісках заяўлены: А. Лукашэнка, Палата прадстаўнікоў і Савет Рэспублікі.

Сутнасьць парушэньняў беларускага заканадаўства і Канстытуцыі ў наступным:

8 сьнежня 1999 года А. Лукашэнка, які займае пасаду Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь, падпісаў у Маскве міжнародны дагавор аб стварэньні саюзнай дзяржавы (далей па тэксце „дагавор"). Дагавор прыняты Палатай прадстаўнікоў 14 сьнежня 1999 года і адобраны Саветам Рэспублікі 22 сьнежня 1999 года. Пры гэтым мы прымаем пад увагу, што ў сьнежні 1999 года ні кіраўнік выканаўчай улады А.Лукашэнка, ні прызначаныя ім раней „палата прадстаўнікоў" і „савет Рэспублікі" не валодалі статусам легітымнай улады, бо не былі абраныя дэмакратычным спосабам (і да таго ж, непрызнаныя міжнароднай супольнасьцю).

Дагавор, а таксама Праграма дзеяньняў Рэспублікі Беларусь і Расейскай Фэдэрацыі па рэалізацыі палажэньняў дагавору аб стварэньні „саюзнай дзяржавы" (далей па тэксце «праграма») супярэчаць Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і парушаюць яе ў наступным:

Артыкулам 1 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь зацьверджана, што „**Рэспубліка Беларусь — унітарная дэмакратычная сацыяльная прававая дзяржава.**

**Рэспубліка Беларусь валодае вяршэнствам і паўнатой улады на сваёй тэрыторыі, самастойна ажыццяўляе ўнутраную і знешнюю палітыку.** „

Дагавор парушае гэтыя асноўныя палажэньні арт.1 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

У артыкуле 1 главы I дагавору запісана:

*„Республика Беларусь и Российская Федерация (далее -государства-участники) создают Союзное государство, которое знаменует собой новый этап в процессе единения народов двух стран в демократическое правовое государство.»*

У артыкуле 7 дагавору сказана:

*«1. Территория Союзного государства состоит из государственных территорий государств-участников.*

*2. Государства-участники обеспечивают целостность и неприкосновенность территории Союзного государства.*

*3. Внешней границей Союзного государства являются границы государств-участников с другими государствами или пространственный предел действия государственных суверенитетов государств-участников.»*

У прэамбуле праграмы запісана:

*„Задача Программы — определение содержания, этапов и сроков*

*работы по передаче Союзному государству зафиксированных в Договоре предметов ведения*, способов законодательного закрепления такой передачи, включая возможное внесение изменений в конституции двух государств, а также организационные рамки этой деятельности в Союзном государстве, создание необходимых союзных или координирующих органов. В нее включаются задачи по осуществлению двумя государствами комплекса взаимосвязанных мероприятий в экономической, правовой и иных сферах, **которые направлены на их поэтапное объединение**.

*Выполнение настоящей Программы ознаменует завершение процесса создания Союзного государства с единым экономическим пространством, единой транспортной системой, единой таможенной территорией, единой денежной единицей, общим бюджетом, в котором государства-участники проводят тесно согласованную политику в международных делах, в сфере обороны, безопасности, борьбы с преступностью, в социальной и культурной областях".*

Такім чынам, Рэспубліка Беларусь у адпаведнасьці з дагаворам з унітарнай дзяржавы ператвараецца ў суб'ект новай незаконна ствараемай саюзнай дзяржавы.

Вышэйшая службовая асоба дзяржавы А.Лукашэнка і органы дзяржаўнай улады — Палата прадстаўнікоў і Савет Рэспублікі перавысілі свае паўнамоцтвы, калі падпісалі і прынялі дагавор, які супярэчыць Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь зацьверджана:

— артыкулам 7 — „**Дзяржава, усе органы і службовыя асобы дзейнічаюць у межах Канстытуцыі і прынятых у адпаведнасці з ёю актаў заканадаўства**";
— артыкулам 8 — „**Не дапускаецца заключэнне міжнародных дагавароў, якія супярэчаць Канстытуцыі**".

Законам Рэспублікі Беларусь „Аб Прэзыдэнце Рэспублікі Беларусь" зацьверджана:

„Статья 3. *Президент осуществляет свою деятельность в целях развития Республики Беларусь как **унитарного** демократического социального правового **государства,***

Статья 16. *Президент осуществляет функции Главы государства в рамках Конституции Республики Беларусь*, настоящего Закона и несет ответственность за правильность и полноту их реализации перед гражданами Республики Беларусь".

Дагавор і пашыраючыя яго акты скіраваныя на карэннае зьмяненьне ў бок пагаршэньня ўмоваў нашага жыцьця, уціскаюць і парушаюць нашыя правы.

У адпаведнасьці з артыкулам 14 дагавору ўсе грамадзяне Беларусі аўтаматычна запісваюцца ў грамадзянства „саюзнай дзяржавы". Такім чынам, нам без нашай волі надаюць статус грамадзянаў ядзернай краіны. Па дагавору Беларусь стала часткай тэрыторыі, на якой створана і дзейнічае аб'яднаная вайсковая групоўка. На тэрыторыі Беларусі разьмешчаныя расейскія стратэгічныя аб'екты і расейскае войска выкарыстоўвае вайсковую інфраструктуру Беларусі (аэрадромы, дарогі, інш.).

Існуе рэальная пагроза беларусам апынуцца на расейскіх войнах. Мы, беларусы, становімся закладнікамі агрэсіўнай палітыкі чужой дзяржавы.

Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, артыкул **10**, гарантуе абарону і заступніцтва дзяржавы кожнаму яе грамадзяніну. А.Лукашэнка і заканадаўчыя органы ў парушэньне Канстытуцыі падпісалі і ратыфікавалі дагавор, які надае грамадзянам Расейскай Фэдэрацыі роўныя правы на тэрыторыі Беларусі, і гэтым ставіць грамадзянаў Беларусі ў безабароннае становішча. У нашай краіне не праведзена прыватызацыя маёмасьці, зямля не замацаваная за грамадзянамі.

У гэтых жыцьцёва важных сфэрах, падобна як і ў вобласьці нацыянальнай адукацыі, палягаюць найбольш масавыя парушэньні правоў грамадзянаў

Беларусі, учыненыя дыктатарскім рэжымам А. Лукашэнкі. Як мы зараз разумеем, гэта рабілася і робіцца пад дыктоўку Масквы. Для Масквы неабходна, каб беларусы ня мелі матэрыяльных асноваў жыцьця на сваёй тэрыторыі. У гэтым выпадку беларусаў будзе лягчэй перамяшчаць дзеля зьдзяйсьненьня імпэрскіх плянаў, выкарыстоўваць як інтэлектуальны людзкі рэсурс на абшарах Расеі, а тэрыторыю Беларусі выкарыстоўваць як пляцдарм для экспансіі на заходнім кірунку.

Таму не праведзена зямельная рэформа. А.Лукашэнка захаваў савецка-калгасную форму гаспадараньня на зямлі.

Таму, з прыходам ў 1994 г. да ўлады А.Лукашэнкі, была спыненая дзейнасьць законаў і праграмы па разьдзяржаўленьні і прыватызацыі, прынятыя ў 1993 г. Вярхоўным Саветам 12-га скліканьня. У адпаведнасьці з гэтым заканадаўствам 50% кошту маёмасьці прамыслова-вытворчай і абслугоўваючай інфраструктуры Беларусі было замацавана за грамадзянамі. Пад гэты кошт была зроблена эмісія імянных прыватызацыйных чэкаў „Маёмасьць”. На сёньняшні час каля трох мільёнаў грамадзянаў Беларусі маюць імянныя прыватызацыйныя чэкі, але пазбаўленыя магчымасьці рэалізаваць сваё законнае права авалодаць сваёй доляй маёмасьці. Прыкладам нахабнага парушэньня маёмасных правоў грамадзянаў з’яўляецца указ А.Лукашэнкі № 70 за 13 лютага 2003 г. Указам ён устанавіў, што найбуйнейшыя дзяржаўныя прадпрыемствы нафта-хімічнага комплексу будуць прадавацца толькі за грошы, без уліку таго, што 50% іх кошту закладзена ў імянных прыватызацыйных чэках „Маёмасьць”.

Тыя формы „разьдзяржаўленьня і прыватызацыі”, якія маюць месца ў Беларусі пачынаючы з 1999 года, не што іншае, як карупцыя ў буйных міжнародных маштабах. А. Лукашэнка за падтрымку яго ўлады на Беларусі разьлічваецца з расейскімі кампаніямі беларускай маёмасьцю.

Перадача выключных паўнамоцтваў па асноўных кірунках дзяржаўнай дзейнасьці іншай дзяржаве (арт. 17 і арт.18 дагавору) ставіць нас, беларусаў, у залежнасьць ад палітыкі іншай дзяржавы, якая карэнным чынам не адпавядае інтарэсам Беларусі.

Дагавор складзены такім чынам, што яго палажэньні дазваляюць пасьлядоўна трансфармаваць суверэнную ўнітарную дзяржаву Рэспубліка Беларусь у суб’ект іншай дзяржавы — Расейскай Фэдэрацыі. Дагавор робіць нікчэмным палажэньне арт. 9 Канстытуцыі ***„Тэрыторыя Рэспублікі Беларусь з’яўляецца натуральнай умовай існавання і прасторавай мяжой самавызначэння народа, асновай яго добрабыту і суверэнітэту Рэспублікі Беларусь”.***

Такім чынам, заключыўшы і зацьвердзіўшы насуперак Канстытуцыі і законам Рэспублікі Беларусь „дагавор” аб стварэньні „саюзнай дзяржавы” з Расеяй, кіраўнік выканаўчай улады Рэспублікі Беларусь А. Лукашэнка і існуючыя вышэйшыя ўлады Рэспублікі Беларусь — Палата прадстаўнікоў і Савет Рэспублікі — парушылі і зламалі нашыя канстытуцыйныя чалавечыя правы. Менавіта:

— права жыць і рэалізоўваць свае сацыяльна-духоўныя і творчыя магчымасьці ў незалежнай суверэннай беларускай дзяржаве;
— права ня ўдзельнічаць у ваенных канфліктах іншай дзяржавы і не аддаваць сваіх сыноў у чужое войска, на чужыя войны;
— права на валоданьне нацыянальнай маёмасьцю, у аснове якой ляжыць праца кожнага беларуса;
— права на стварэньне прыватнай уласнасьці на аснове беларускай нацыянальнай маёмасьці;
— права ўласнасьці на зямлю (з-за стварэньня неспрыяльных для беларусаў эканамічна-праўных умоваў);
— права на інтэлектуальную маёмасьць беларускай нацыі (у выніку вынішчэньня беларускай нацыянальнай адукацыі);
— права на адукацыю ў роднай мове (у выніку ліквідацыі беларускай нацыянальнай агульнаадукацыйнай і вышэйшай школы);
— права на беларускую нацыянальна-культурную самарэалізацыю асобы (у выніку ліквідацыі афіцыйнага ўжываньня беларускай мовы).

Пад шыльдай „інтэграцыі” разбураюцца эканамічныя, культурныя, тэрытарыяльныя асновы існаваньня 10-мільённага беларускага народа. Не ў інтарэсах эўрапэйскіх краінаў і тым больш суседзяў: Латвіі, Літвы, Польшчы, Украіны, каб у Беларусі ствараліся ўмовы для выціскаьня працавітага, таленавітага, беларускага народа са сваёй тэрыторыі і засяленьня яе іншымі людзьмі, з іншым мэнталітэтам, для якіх гэтая тэрыторыя чужая.

Не прынясе карысьці эўрапэйскай цывілізацыі і эўрапэйскаму інтэлекту імкненьне некаторых эўрапэйскіх палітыкаў і некаторых колаў эўрапэйскага бізнэсу, зьвязаных з гандлем і спажываньнем нафта-газавых і іншых сыравінных расейскіх рэсурсаў, пайсьці на згоду з расейскім імпэрскім рэжымам і падштурхнуць беларусаў у абдымкі дэградуючай расейскай імпэрыі.

Суды Рэспублікі Беларусь у парушэньне заканадаўства адмовілі нам у судовым парадку абараніць свае канстытуцыйныя правы. Суды, як і заканадаўчая ўлада: Палата прадстаўнікоў і Савет Рэспублікі, залежныя ад дыктатара і яго выканаўчых структураў.

***Мы просім АБСЭ скарыстаць існуючыя ў яе распараджэньні мэханізмы для ўстанаўленьня факту парушэньня нашых агульначалавечых правоў і канстытуцыйных правоў грамадзянаў Беларусі. Просім дапамагчы тэрмінова спыніць дзейнасьць Расейскай Фэдэрацыі па ліквідацыі дзяржаўнага суверэнітэту і незалежнасьці Рэспублікі Беларусь. Просім разглядзець гэтае пытаньне на спэцыяльнай сэсіі Парляманцкай Асамблеі АБСЭ.***

Тэрміновасьць вызначаецца тым, што Масква падрыхтавала „канстытуцыйны акт саюзнай дзяржавы” і праз А.Лукашэнку плянуе ў бліжэйшы перыяд правесьці ў Беларусі рэфэрэндум па яго прыняцьці. Мэта рэфэрэндуму па „канстытуцыйным акце” — прыдаць выгляд легітымнасьці працэсам паглынаньня Беларусі Расіяй, якія рэалізуюцца ў адпаведнасьці з дагаворам. Рэжым А.Лукашэнкі сфармаваў такую сістэму фальсіфікацый выбараў і рэфэрэндумаў, што ні выбары, ні рэфэрэндумы не выяўляюць выбар беларускага народа. Сістэма фальсіфікацыі выбараў пры адсутнасьці дэмакратыі ў краіне забясьпечвае выйграньне дыктатару незалежна ад рэальнага волявыяўленьня выбаршчыкаў. Што неаднаразова ўжо пацьвердзілі выбары і рэфэрэндумы, якія праводзіліся ў Беларусі лукашэнкаўскім рэжымам.

*10 ліпеня 2003 г., Менск*

***Папкоў С. Кашэль К.***
***Пляшко Г. Радзюк А.***
***Чахольскі А. Юхо У.***

# ЗВАРОТ ДА ГРАМАДЗЯНАЎ БЕЛАРУСІ

***Адзінай крыніцай дзяржаўнай улады і носьбітам суверэнітэту ў Рэспубліцы Беларусь зьяўляецца народ.***

*Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь (арт.3)*

Паважаныя грамадзяне!

Мы, Кастусь Кашэль, Сяргей Папкоў, Генадзь Пляшко, Алег Радзюк, Алесь Чахольскі, Уладзімер Юхо, падалі іскавыя заявы ў Вярхоўны суд з мэтай спыніць гвалт над нашымі канстытуцыйнымі правамі, прызнаць несапраўдным дагавор аб стварэньні саюзнай дзяржавы. Адказчыкамі па нашых исках заяўлены: А. Лукашэнка, Палата прадстаўнікоў і Савет Рэспублікі.

У сьнежні 1999 г. Лукашэнка падпісаў, а Палата прадстаўнікоў і Савет Рэспублікі ратыфікавалі Дагавор аб стварэньні саюзнай дзяржавы. Яны перавысілі свае паўнамоцтвы, калі падпісалі і прынялі Дагавор, які супярэчыць Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь зацьверджана:

— артыкулам **1** — *„Рэспубліка Беларусь — унітарная дэмакратычная сацыяльная прававая дзяржава. Рэспубліка Беларусь валодае вяршэнствам і паўнатой улады на сваёй тэрыторыі, самастойна ажыцьцяўляе ўнутраную і зьнешнюю палітыку.”*
— артыкулам **7** — *„Дзяржава, усе органы і службовыя асобы дзейнічаюць у межах Канстытуцыі і прынятых у адпаведнасьці зь ёю актаў заканадаўства”;*
— артыкулам **8** — *„Не дапускаецца заключэньне міжнародных дагавораў, якія супярэчаць Канстытуцыі”.*

Законам Рэспублікі Беларусь *„Аб Прэзыдэнце Рэспублікі Беларусь"* зацьверджана:

— артыкулам **3** — *„Прэзыдэнт выконвае сваю дзейнасьць у мэтах развіцьця Рэспублікі Беларусь як* ***унітарнай*** *дэмакратычнай сацыяльнай прававай* ***дзяржавы****";*

— артыкулам 16 — *„Прэзыдэнт выконвае функцыі Галавы дзяржавы ў межах Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, гэтага Закона і нясе адказнасьць за правільнасьць і паўнату іх рэалізацыі перад грамадзянамі Рэспублікі Беларусь."*

Дагавор, якіператварае ўнітарную дзяржаву Рэспубліку Беларусь у суб'ект нейкай незаконнай *„саюзнай дзяржавы"* ня ёсць дагавор, гэта ёсць змова. Аб'ектам змовы сталі мы, усе грамадзяне Беларусі. А. Лукашэнка, палатнікі, міністры сталі на шлях парушэньня Канстытуцыі і заканадаўства нашай дзяржавы. За паслугі і дапамогу Масквы ва ўтрыманьні ўлады яны разьлічваюцца нацыянальнымі інтарэсамі, нашым жыцьцём, нашай зямлёй, нашай тэрыторыяй, нашай маёмасьцю.

**Ёсьць магчымасьць спыніць гэтае беззаконьне**. Трэба дэнансаваць дагавор-змову або праз суд прызнаць яго несапраўдным. Дзеля гэтага мы падалі іскі ў суд.

Мы ведаем, што нашы суды і пракуратура ( як і палаты) не самастойныя, зьяўляюцца інструмэнтам ў руках рэжыму. Мы не чакаем ад іх станоўчага рашэньня.

Аднак ёсьць адна акалічнасьць, якая робіць гэты дагавор-змову нікчэмным. Змоўшчыкі ведаюць, што яны парушылі нормы міжнароднага права, зацьверджаныя Статутам і дакумантамі Арганізацыі Аб'еднаных Нацыяў. Таму гэты дагавор-змову спрабуюць падаць у прыгожай упакоўцы пад шыльдай *„інтэграцыі брацкіх народаў"*. Таму падрыхтавалі *„канстытуцыйны акт"* так званай *„саюзнай дзяржавы"* і плянуюць учыніць *„рэфэрэндум"* для беларусаў, спрабуючы *„постфактум"* прыдаць выгляд легітымнасьці гэтай змове. Калі нічога не рабіць, то пры той машыне фальсіфікацыяў, якая створана рэжымам, *„дабраахвотнае"* прыняцьце *„канстытуцыйнага акта"* будзе забясьпечана.

Гэтага нельга дапусьціць. Паколькі суды незаконна адмовіліся разглядаць нашы іскавыя заявы, мы накіравалі зварот у Камісію па правах чалавека Арганізацыі Аб'еднаных Нацыяў. У звароце выказана прашэньне выкарыстаць мэханізмы, якія мае ў распараджэньні Камісія, і дапамагчы:

1. *Разгледзець справу па нашыхісках у Міжнародным судзе Арганізацыі Аб'еднаных Нацыяў з мэтай прызнаньня несапраўдным Дагавора аб стварэньні Саюзнай дзяржавы.*
2. *Вынесьці на разгляд Савета Бясьпекі Арганізацыі Аб'еднаных Нацыяў пытаньне аб спыненьні агрэсіўных дзеяньняў Расейскай Фэдэрацыі ў дачыненьні да Рэспублікі Беларусь.*

Для атрыманьня станоўчага выніку запачаткавана стварэньне ініцыятыўнай групы, якая разгортвае працу па далучэньні грамадзянаў да калектыўнай заявы ў Вярхоўны суд з патрабаваньнем прызнаньня несапраўдным незаконнага дагавора аб стварэньні саюзнай дзяржавы.

***Заклікаем беларусаў*** *стаць на абарону сваіх жыцьцёвых інтарэсаў, інтарэсаў сваіх дзяцей і ўнукаў — прыняць удзел у стварэньні і працы ініцыятыўнай групы або падпісаць калектыўную заяву ў Вярхоўны суд.*

***Заклікаем усіх грамадзянаў, журналістаў, сродкі масавай інфармацыі, грамадзкія арганізацыі, партыі, праваабарончыя цэнтры*** *выкарыстаць свой уплыў, рэсурсы, сувязі для інфармаваньня беларускага і міжнароднага грамадзтва аб незаконнасьці і нікчэмнасьці Дагавора аб стварэньні „саюзнай дзяржавы".*

*Заклікаем не дапусьціць правядзеньня ашуканскага рэферэндуму, на якім нам будзе прапанавана зацьвердзіць учыненае над намі злачынства. У гісторыі чалавецтва, відаць, не знойдзецца прыкладаў такой зьдзеклівай і нахабнай агрэсіі.*

*У выпадку, калі зьдзеклівы рэфэрэндум будзе прызначаны, трэба арганізаваць агульны байкот. Ніхто не павінен ісьці галасаваць. Лукашэнкаўская машына фальсіфікацыяў павінна пракруціцца ўпустую.*

***Ліквідуем антыканстытуцыйны дагавор-змову, не дапусьцім „рэфэрэндуму" — выпадзе расейская падпорка з-пад лукашэнкаўскага рэжыму, і ён абваліцца. Няма яму падтрымкі на Беларусі.***

Мы абавязаны выканаць сваё канстытуцыйнае права найвышэйшай улады ў нашай дзяржаве. У Беларусі павінны быць праведзеныя новыя прэзыдэнцкія выбары пад міжнародным пратэктаратам.

*Грамадзяне Беларусі:*

*Кастусь Кашэль Генадзь Пляшко*

*Алесь Чахольскі Сяргей Папкоў*

*Алег Радзюк Уладзімер Юхо*

Для кантактаў зьвяртацца па адрасе: 220071, Мінск-71, а/с 153,

Тэл. 8-0296-61-51-43, E-mail: belsalidar@tut.by

*24 ліпеня 2003 г., Менск*

# ХРОНІКА ПАРУШЭНЬНЯЎ ПРАВОЎ БЕЛАРУСАЎ

## *ВЕРАСЕНЬ — 2002 (працяг з №3 (49)2003)*

*7 верасьня.* Апоўначы ***Стась Пачобут*** з сябрамі вяртаўся з дня народзінаў, калі да іх пад'ехалі міліцыянты, надзелі кайданкі і завезьлі яго і яшчэ трох хлопцаў у дзяжурную частку Ленінскага РАУС. Па словах Стася, зьбіваць яго пачалі ўжо ў машыне. Калі да дзяжурнай часткі падышоў ***Андрэй Пачобут***, ягоны брат, міліцыянты выкідалі зьбітага брата на вуліцу. Андрэй пачаў патрабаваць, каб да Стася выклікалі *„хуткую дапамогу"*. Медыкаў выклікалі. *„Хуткая"* забрала Стася ў шпіталь, гэта зафіксавана ў журнале дастаўленых у дзяжурную частку.

*8 верасьня,* днём, каля пасольства Расеі ў Менску адбылася несанкцыянаваная акцыя-пэрфоманс. Яна была арганізаваная незарэгістраванай арганізацыяй *„Малады Фронт"* і праводзілася ў гонар гадавіны ***Бітвы пад Воршай 1514 года***, ***падчас якой беларускае войска разьбіла расейскага праціўніка***, ***які нашмат перавышаў яго па колькасьці***. Больш за 10 актывістаў *„Маладога Фронту"* разгарнулі каля пасольства плякат з надпісам: *„Пуцін, табе трэба другая Ворша?"; „Рукі прэч ад Беларусі!"* і скандзіравалі лёзунг *„Жыве Беларусь!"*.

Завязалася невялікая бойка, падчас якой работнікі міліцыі спрабавалі затрымаць удзельнікаў акцыі. На працягу некалькіх хвілінаў будынак пасольства быў ачэплены міліцыянтамі з аўтаматамі. Паводле зьвестак БелаПАН, затрыманы адзін з удзельнікаў акцыі.

*9 верасьня* суддзя Ленінскага раёну Горадні **Дзімітры Дземчанка** асудзіў на 10 сутак адміністрацыйнага арышту горадзенскага мастака ***Дзімітрыя Іваноўскага*** за ўдзел у несанкцыянаваным пікетаваньні 8 ліпеня сёлета пад назвай *„ланцуг неабыякавых людзей"*.

*11 верасьня.* Суддзя Цэнтральнага раёну Менска **Т**. **Паўлючук** пакараў удзельніка несанкцыянаванага пікету каля расейскай амбасады *8 верасьня* ***Зьміцера Дашкевіча*** *(„Малады Фронт")* на 15 сутак адміністрацыйнага арышту.

*14 верасьня* каля ўласнага дому ў Менску быў зьбіты намесьнік старшыні нядаўна заснаванай Аб'яднанай сацыял-дэмакратычнай партыі ***Аляксей Кароль***. Напалі на яго позна ўвечары, калі ён вяртаўся з вакзала пасьля паездкі ў Вільню, дзе беларускія сацыял-дэмакраты сустракаліся з летувіскімі калегамі. Яму нанесьлі ўдар па галаве цяжкім прадметам. Сп. Кароль страціў прытомнасьць. Мэдыкі выявілі ў пацярпелага страсеньне мазгоў. У сп. Караля скралі сумку з пашпартам. Сам ён не выключае, што напад мае палітычную афарбоўку.

*16 верасьня* суддзя Першамайскага раёну Менска **Уладзімер Кобышаў** абвясьціў прысуд па крымінальнай справе ***Віктара Івашкевіча***: 2 гады абмежаваньня волі (гэтакзваная *„хіміі"*). В. Івашкевіч прызнаны вінаватым па абодвух пунктах абвінавачваньня: у спробе паклёпу ў адрас *„прэзыдэнта"* Беларусі (частка 2 артыкула 367 Крымінальнана Кодэксу) і ў зьдзяйсьненьні публічнай абразы *„прэзыдэнта"* (частка 2 артыкулу 368 КК).

*16 верасьня* ў Менску былі затрыманыя ўдзельнікі пікету, прысьвечанага зьніклым палітыкам: ***Дзімітры Філіповіч***, ***Міхаіл Тарасюк*** і ***Георгі Саламянік***. Яны пікетавалі будынак *„адміністрацыі прэзыдэнта"*, раздаючы менчукам улёткі. Праз 50 хвілін іх затрымала міліцыя і адвезла ў Ленінскі РУУС.

*Верасень.* На сёньняшні дзень ***у Горадні няма ўжо ня толькі ніводнай беларускай школы, а нават ніводнага беларускага пачатковага кляса.***

Русіфікацыя фарсіруецца і ў вышэйшай школе. Актывісты ТБМ сустрэліся з прарэктарам Горадзенскага аграрнага ўнівэрсітэту **Леанідам Жучко**. Яны даводзілі чыноўніку неабходнасьць выкладаньня на дзяржаўнай мове. А той за словам у кішэню не палез, сказаў: „А ў нас студэнт з Краснадара! А? Як быць зь ім, калі ўвесьці беларускую мову?..” „Геніяльная” вынаходлівасьць бюракратычнай галавы.

*23 верасьня ў Менску* каля свайго дома быў жорстка зьбіты вядомы літаратуразнаўца, празаік, прэзыдэнт Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў 70-гадовы ***Адам Мальдзіс***. Бандыты скралі сумку з пашпартам вучонага, а таксама з пячаткай асацыяцыі і дакументы аб правядзеньні 9-10 кастрычніка міжнародных чытаньняў, прысьвечаных ***Іосіфу Гашкевічу*** (гэты знакаміты беларус быў першым консулам Расейскай імпэрыі ў Японіі, аўтарам першага японска-расейскага слоўніка). Як паведаміў сп. Мальдзіс, правядзеньне гэтых чытаньняў раздражняла шэраг асобаў, якія намагаліся ўскладніць гэтую працу. Пацярпелы ня верыць, што гэта хуліганскі напад. За апошні час бандыты рэгулярна па-зьверску зьбіваюць нашых вучоных і паважаных людзей.

*28 верасьня ў Менску* каля $21^{00}$ на аўтобусным прыпынку адбыўся напад на журналіста радыё „Рацыя” ***Генадзя Кесьнера***. Пасьля таго, як журналіст выйшаў з аўтобуса, невядомы нанёс яму некалькі ўдараў па галаве. Г. Касьнер страціў прытомнасьць і быў дастаўлены ў шпіталь, дзе была канстатавана адкрытая чэрапна-мазгавая траўма. (*Характэрна, што ва ўсіх выпадках нападаў, асобы, якія ўчынілі гэтыя напады, засталіся невядомымі.)*

*29 верасьня* ў Калінкавічах (Гомельская вобласьць) адбыўся пікет супраць выключэньня райцэнтра і некалькіх вёсак раёна са сьпісу забруджаных радыяцыяй тэрыторыяў. Вось як, аказваецца, ***рэжым змагаецца з наступствамі Чарнобыля — адмяняе радыяцыю дэкрэтамі***. Арганізатары акцыі — актывісты грамадзкага аб’яднаньня „Грамадзтва і мы”—на працягу гадзіны зьбіралі подпісы пад пэтыцыяй пратэсту, каб потым перадаць іх у галоўныя „крыніцы справядлівасьці” існуючага рэжыму: ва ўрад, канстытуцыйны суд і „адміністрацыю прэзыдэнта”.

*29 верасьня ў цэнтры Менску,* каля помніку Янку Купалу, грамадзяне горада з удзелам прадстаўнікоў іншых гарадоў Беларусі правялі мітынг у абарону суверэнітэту і незалежнасьці Беларусі, супраць агрэсіўных заяваў кіраўніцтва Расеі аб плянах анэксіі Беларусі. Менгарвыканкам не дазволіў Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ праводзіць мітынг каля помніка Янку Купалу, правядзеньне мітынгу ўсклалі на сябе арганізацыі ***Беларускага Нацыянальна-Вызвольнага Руху*** і ***Менскі Камітэт па абароне Беларусі ад расейскай агрэсіі***.

Пад няспынным ўціскам міліцыі, накіраванага на спыненьне мітынгу, яго ўдзельнікі аднагалосна прынялі рэзалюцыю. Быў зачытаны зварот ***Зянона Пазьняка,*** Старшыні Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне”. Выступіў ***Юры Беленькі***, Выконваючы абавязкі старшыні Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне” на Беларусі, з аналізам эканамічнай і інфармацыйнай вайны Расеі супраць Беларусі. Удзельнікі мітынгу прасьпявалі гімн ***„Магутны Божа”***.

Ход падзеяў у пэрыяд падрыхтоўкі, а таксама падчас правядзеньня мітынгу і пасьля яго завяршэньня выявіў хлусьлівасьць Лукашэнкі і ягонага рэжыму, пацьвердзіў, што для іх суверэнітэт Беларусі ёсьць фразэалёгія, інфармацыйная завеса іхнай здрадніцкай палітыкі на карысьць Расеі. У той час, калі пастаянна даецца дазвол у цэнтры горада праводзіць розныя забаўляльныя „піўныя-п’яныя” мерапрыемствы, улады забаранілі правядзеньне мітынгу на плошчы ля помніка Янку Купалу па галоўнай для беларускай нацыі тэме: „Абарона суверэнітэту і незалежнасьці Беларусі”. Перад пачаткам і падчас правядзеньня мітынгу вакол помніка Янку Купалу была дыслакаваная армада міліцыянтаў і пераапранутых „спэцоў”, якія імкнуліся спыніць правядзеньне мітынгу. Непасрэдна на плошчы міліцыянтамі кіраваў падпалкоўнік **Вераб’ёў**, адзін з кіраўнікоў Упраўленьня МУС Менску.

Пасьля завяршэньня мітынгу, калі ўдзельнікі выйшлі на прылягаючыя вуліцы і праспэкт Ф. Скарыны, па міліцэйскіх рацыях была дадзена каманда на арышт актывістаў мітынгу. „Спэцназ” пры дапамозе „спэцоў” у цывільным, якія па рацыях каардынавалі іх дзейнасьць, гвалтоўна напаў на актывістаў. Былі арыштаваныя кіраўнікі і сябры Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне” і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ ***Юры Беленькі***, ***Валеры Буйвал***, ***Кастусь Кашэль***, ***Уладзімер Плотнікаў*** і ***Здзіслаў Абрэмскі***.

*30 верасьня* ў судзе Цэнтральнага раёну Менска адбыўся суд над удзельнікамі мірнага мітынгу ў абарону суверэнітэту і незалежнасьці Беларусі, які праходзіў *29 верасьня ў Менску*. Працэс праводзіўся з грубымі парушэньнямі. Суддзя **Вайцяхоўская** не дазволіла ўдзельнікам мітынгу скарыстацца правам дапамогі свайго адваката і выклікала дзяржаўнага адваката, які ўдзельнікамі мітынгу быў адхілены. *Юры Беленькі* зрабіў заяву аб адводзе суддзі ў сувязі з тым, што суддзя Вайцяхоўская ў красавіку 2000 года судзіла яго і вынесла незаконны прысуд, які быў адменены Менскім гарадзкім судом. Але гэтая заява не была прынятая. ***Юры Беленькі***, ***Уладзімер Плотнікаў*** і ***Здзіслаў Абрэмскі*** атрымалі прысуд — па трое сутак зьняволеньня. Суд над ***Валеры Буйвалам*** і ***Кастусём Кашэлем*** перанесены на 1 кастрычніка.

*30 верасьня* Беларускае тэлеграфнае агенцтва са спасылкай на прэс-службу Міністэрства юстыцыі паведаміла пра адмову ў рэгістрацыі для Аб’яднанай сацыял-дэмакратычнай партыі. Падставы для адмовы выглядаюць блытанымі, супярэчлівымі і неабгрунтаванымі.

*Верасень.* Паводле зьвестак Міністэрства статыстыкі і аналізу, у 2001 г. каэфіцыент нараджальнасьці ў Беларусі склаў 9,2 на 1000 насельніцтва. Узровень сьмяротнасьці склаў 14,1 праміле, натуральныя страты насельніцтва — 4,9 праміле. У параўнаньні з 2000 г. гэтыя паказчыкі крыху пагоршыліся: тады каэфіцыент нараджальнасьці склаў 9,4 праміле, узровень сьмяротнасьці — 13,5 праміле, натуральныя страты насельніцтва — 4,1. Чакаемая працягласьць жыцьця для мужчынаў у Беларусі — 62,8 года, для жанчынаў — 74,5 года.

*Верасень.* У эміграцыю ў Бэльгію падаўся былы ахоўнік М. Чыгіра **Лёня Васючэнка**, сумнавядомы кагэбісцкі правакатар у БНФ.

## *КАСТРЫЧНІК-2002*

*1 кастрычніка у* Менску былі асуджаныя ўдзельнікі несанкцыянаванага мітынгу ў абарону незалежнасьці Беларусі актывісты Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ ***Валер Буйвал*** і ***Кастусь Кашэль***.

Затрыманыя 29 верасьня пасьля заканчэньня мітынгу ў парку Янкі Купалы, *Валеры Буйвал* і *Кастусь Кашэль* двое сутак да суду правялі ў спэцпрыёмніку.

Суды над спадарамі Кашэлем і Буйвалам працягваліся ня больш за 20 хвілінаў. Судзьдзя Цэнтральнага раёну Менску **Натальля Вайцяховіч** адмовіла *Валеры Буйвалу* і *Кастусю Кашэлю* скарыстацца правам прыцягнуць да разгляду справы свайго адваката, цынічна заявіўшы, што ў іх было дастаткова часу (знаходзячыся за кратамі!), каб запрасіць адваката. Сябры адхілілі дзяржаўнага адваката і выказалі пратэст супраць парушэньня закону і працэдуры. Суддзя адхіліла пратэсты, заслухала сьведак міліцыянтаў, прачытала іхныя рапарты, прызнала В. Буйвала і К. Кашэля вінаватымі ва ўдзеле ў не дазволенай уладамі акцыі і пакарала іх трохсутачным адміністратыўным арыштам.

„Ужо ўсім зразумела паводле гэтых працэсаў, а таксама агульнапалітычных працэсаў у нашай краіне, што заявы Лукашэнкі пра ягоную абарону сувэрэнітэту Беларусі ёсьць хлусьлівай рыторыкай. Гэтыя рэпрэсіі, ўжытыя супраць сапраўдных абаронцаў незалежнасьці, вынікаюць якраз з сутнасьці гэтага прамаскоўскага рэжыму, які ў любы момант гатовы здаць нашую Бацькаўшчыну ў маскоўскі палон, — падкрэсьліў *Валеры Буйвал*. — Гэта не судовае рашэньне — гэта традыцыйнае судзілішча, той самы савецкі суд. Гэта маленькі фрагмэнт той шырокай мазаікі беззаконьня, якое разгарнулася й дзейнічае на працягу шэрагу гадоў у нашай краіне”.

Суддзя відавочна дзейнічала па загаду ўладаў у парушэньне закону. Арыштаваных актыўна падтрымлівалі сябры Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне”, якія знаходзіліся ў зале суда, перадавалі перадачы, падтрымлівалі сем’і арыштаваных.

***(Рэдакцыя „Бел. Вед.”; Інфармацыйная камісія Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ; Прэс-служба Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ)***

# „БЕЛАРУСКІ ДЗЕНЬ” У КАНГРЭСЕ ЗША

Ідэя правесьці *„Беларускі дзень”* у Кангрэсе была выказаная кангрэсмэнам ***Стывенам Лятарэтам*** у час спатканьня зь ім беларусаў 28-га траўня, пра якое ўжо паведамлялася ў травеньскім нумары *„Беларускіх Ведамасьцяў”*.

Сутнасьць мерапрыемства ў тым, што ў Кангрэс прыязджае грамада беларусаў з розных штатаў і на працягу аднаго дня, разьмеркаваўшыся, спаткаецца па чарзе з шэрагам ужо падрыхтаваных кангрэсмэнаў, якім выкладае свае меркаваньні й пажаданьні па пэўных пытаньнях.

Ідэя правядзеньня *„Беларускага дня”* нам вельмі падыходзіла і вынікала з двух задачаў. Найперш, знайсьці падтрымку (і галасы) амэрыканскіх кангрэсмэнаў для *„Акту аб дэмакратыі ў Беларусі”*, праект якога акурат знаходзіцца ў Кангрэсе і будзе разглядацца ў верасьні-кастрычніку. Наступнае — агульнаю мэтаю: здабыць актыўнае пацьверджаньне гарантыяў незалежнасьці Беларусі з боку Амэрыкі ў сувязі з далейшым разгортваньнем расейскай палітыкі па інкарпарацыі Беларусі, падрыхтоўкаю да ліквідацыі беларускіх грошай і да чарговага антыканстытуцыйнага рэфэрэндуму па фактычнай анэксіі Беларусі (прыняцьце так званага *„канстытуцыйнага акту”*).

Тут трэба нагадаць, што ў сьнежні 1994 году ў Будапэшце на сэсіі АБСЭ тры краіны — ЗША, Вялікабрытанія і Расея — падпісалі мэмарандум (пасьля таго, як Беларусь адмовілася ад ядзернай зброі) аб гарантыях суверэнітэту Беларусі й абавязаліся быць ягонымі гарантамі ў выпадку ўзьнікненьня пагрозы дзяржаўнай незалежнасьці. Гэтая пагроза якраз і павялічылася з боку аднаго з *„гарантаў”* — Расеі. У размовах з кангрэсмэнамі (у прыватнасьці, з ***Рашам Голтам***) мы асабліва акцэнтавалі ўвагу на тым, што Расея ня можа быць пасярэднікам у дачыненьнях зь Беларусьсю, бо яе інтарэсы вялікадзяржаўныя, накіраваныя супраць нашай незалежнасьці. Амэрыканскія палітыкі, якія спадзяюцца на Расею, ня ўлічваюць гэтага.



***У Кангрэсе ЗША, офіс кангрэсмэна Фрэнка Палёна. Зьлева направа: З. Пазьняк, В. Кіпель, Ю. Азарка, У. Кадола, Ф. Палён, В. Станкевіч, В. Зайка, А. Шчэрбацэвіч, Н. Гарашкова.***

Каб падрыхтаваць *„Беларускі дзень”* у Кангрэсе як збалянсаванае мерапрыемства, патрэбна мінімум два месяцы. У нас жа было максімум два тыдні, бо, фактычна, з 23-га чэрвеня кангрэсмэны пачынаюць разьяжджацца на вакацыі. Збольшага нашыя актывісты пасьпелі папрацаваць толькі ў двух штатах (Нью-Ёрку і Нью-Джэрзі), падрыхтавалі мэмарандумы, заявы, паведамленьні, інфармацыю.

17-га чэрвеня ў Вашынгтоне адбыліся заплянаваныя сустрэчы. Восем беларускіх прадстаўнікоў абышлі восем дэпутацкіх офісаў і спаткаліся з шасьцю кангрэсмэнамі, перадалі дакументы й інфармацыйныя матэр'ялы. (Кангрэсмэн ***Палён*** пры гэтым згадзіўся ўзяць удзел у беларускім сьвяце ў Гайленд-Парку, у царкве, у сярэдзіне ліпеня.) У Кангрэс езьдзілі ***Вітаўт Кіпель***, ***Юрка Азарка***, ***Вячка Станкевіч***, ***Віталь Зайка***, ***Уладзімер Кадола***, ***Уладзімер Шчэрбацэвіч***, ***Натальля Гарашкова***, ***Зянон Пазьняк***.

Меркаваліся таксама спатканьні з кангрэсмэнамі беларускай дэлегацыі штату Агаё. Гэтая праграма была выкананая часткова. Тут, як, зрэшты, і паўсюдна — галоўная праца яшчэ наперадзе.

Назаўтра, 18-га чэрвеня, мы са спадаром В. Кіпелем мелі зьмястоўную размову ў Дзяржэпартамэнце са спадаром ***Майклам Уягарам***, а напярэдадні — з добра знаным у беларускім і ўкраінскім асяродзі спадаром ***Арэстам Дэйчакіўськім***.

Падсумоўваючы ўсе праведзеныя візіты й перамовы, можна сказаць, што пакладзены добры пачатак. Усюды мы знайшлі прыхільнасьць у пытаньнях, якія ставіліся. Зразумела. Што трэба працягваць працу ў гэтым кірунку. Кангрэсмэны абяцалі падтрымаць *„Акт аб дэмакратыі ў Беларусі”*. А гэта галасы ў беларускі актыў.

*„Беларускі дзень”* добра было б праводзіць кожны год і арганізоўваць яго заранёў з шырокім прадстаўніцтвам.

***Зянон ПАЗЬНЯК***

# ЦЯГНІК

Прыгарадны цягнік паміж Зэльваю і Ваўкавыскам спыняецца тры разы: выходзяць і заходзяць людзі, якія ці прыехалі, ці едуць адведаць родных ці знаёмых, хтосьці па іншых справах.

На прыпынку Савічы цягнік ужо пачаў набіраць хаду, але раптоўна спыніўся: у вакно вагона было бачна, як мэтраў за трыста, не па дарозе, а напрасткі, па сьнезе бег каржакаваты мужчына гадоў пад пяцьдзесят, трымаючы ў руках вялізную сумку. Не збаўляючы хады, мужчына ўпэўнена набліжаўся да цягніка.

Усе пасажыры з правага боку вагона назіралі за тым, што адбываецца. Імгненьні былі доўгімі... Але вось у тамбуры мільганула цень. Дьверы з шыпячым сьвістам зачыніліся. Цягнік пачаў рухацца далей. З тамбура разьехаліся ў розныя бакі створкі дзьвярэй — уваходзіў *„бягун”*. Паставіўшы сумку ля вольнага месца, нясьпешна сеў. Расчырванелы, зь яго йшла пара, стомлены ад працяглага бегу ён цяжка адсопваўся. На яго твары не было ні радасьці, ні задавальненьня сабою ці машыністам; была нейкая будзённасьць, незначнасьць адбытага...

Празь некалькі хвілінаў мужчына даставаў з кішэні грошы, каб набыць у падышоўшай кандуктаркі квіток.

*„Добра на Беларусі, — падумалася мне. — Добра там, дзе свае”.*

***Юры КАЧУК***

# ПРЭС-РЭЛІЗ

*(паводле „Народнай Волі”, „Нашай Свабоды” і радыё.)*

## *ТРАВЕНЬ — 2002 (працяг з №3(49) 2003г.)*

■ За пэрыяд з 1990 г. колькасьць працуючых у Беларусі скарацілася з 5 мільёнаў 150 тысячаў да 4 мільёнаў 400 тысячаў, а колькасьць пэнсіянэраў павялічылася з 2 мільёнаў 357 тысячаў да 2 мільёнаў 629 тысячаў. Доля жыхароў ва ўзросьце ад 16 да 30 гадоў складае толькі 20%, што сярод іншага памяншае магчымасьці пэнсійнай сістэмы. Калі эканамічнае і дэмаграфічнае становішча ня будзе паляпшацца, то ў 2015 г. у краіне ня будзе хапаць рабочых.

■ Расейскія журналісты прыяжджалі ў Менск на канфэрэнцыю і распавядалі цікавыя рэчы пра пуцінскую дэмакратыю. Так ***Алег Панфілаў*** паведаміў, што „цяпер у Расеі разгорнута сетка судовых працэсаў супраць незалежных

выданьняў, шмат расейскіх журналістаў сядзяць у турме. Так у Кіраве ўзбудзілі судовую справу супраць галоўнага рэдактара мясцовай газэты за публікацыю анэкдота пра губэрнатара. Цікава адзначыць, што напярэдадні „губэрнатар” сам аб’явіў конкурс на лепшы анэкдот пра сябе. Паўсюдна невядомыя ў камуфляжнай вопратцы, масках і са зброяй ладзяць пагромы ў рэдакцыях (гэта называецца ў расейцаў „маскі-шоў”). Значна павялічылася колькасьць судовых справаў аб абароне гонару і годнасьці Пуціна...” Панфілаў назваў гэтыя працэсы „зачысткай інфармацыйнай прасторы”.

■ Камэдыя пачынаецца... Намэнклятурная або інакш „аб’яднаная апазыцыя” правяла паседжаньне свайго КРДС, дзе прыняла рашэньне ісьці на арганізуемыя незаконным рэжымам незаконныя ж мясцовыя выбары ў 2003 г. Гэтым яны нават распачалі ўтварэньне кааліцыі на „выбары”, што адлюстравалася ў мэмарандуме „Аб прынцыпах узаемадзеяньня і каардынацыі дзеяньняў падчас падрыхтоўкі і правядзеньня мясцовых выбараў”. Як вядома, у гэтай „кааліцыі” аб’ядноўваюцца настолькі кантрастныя палітычныя групоўкі, што некаторым з іхных прадстаўнікоў стала няёмка перад публікай. Так, сакратар ЦК кампартыі Алена Скрыган сказала журналістам, што кааліцыя камуністаў і правых партыяў выглядае як мінімум недарэчнай, і ўстрымалася ад галасаваньня. А вось **А**. **Лебедько** (ён жа Лябедзка) заявіў, што палітычныя партыі нарэшце пераходзяць ад фантазіяў да канкрэтнай працы (*геніяльна! Трэба ўнесьці ў кнігу Гінэса!*).

АГП сфармулявала яшчэ адну „геніяльную” ідэю, імпэтна падтрыманую астатнімі: заклікаць эўрапейскія структуры вярнуцца да фармату „тройкі”, якая б „артыкулявала сінхранізаваныя дзеяньні эўрапейскіх структураў” *(і цэнтралізавана выдавала б грошы барацьбітам за мясцовую выбарчую свабоду).*

■ Урэшце гэта прагучала адкрыта... ***Аляксандр Старыкевіч*** у артыкуле *„Звычайнае зло” („Народная Воля”, 31.05.2002)* спакойна прааналізаваў вобраз і стыль нашых „апазыцыйных” намэнклятуршчыкаў: „Апазыцыя даўно ўжо стала сістэмнай. Ва ўсякім разе яе лідэры ўпісаліся ў сістэму, пабудаваную ўладай: прычым у якасьці падтрымліваючых, страхуючых элемэнтаў. Вячорка, Статкевіч, ня кажучы ўжо пра людзей, што называюць сябе каардынатарамі „Хартыі-97”, ствараюць выгадны для Лукашэнкі фон, дзякуючы якому цяперашні кіраўнік дзяржавы глядзіцца лепш, чым ён ёсьць на самой справе. Аднак, гэты дзіўны сімбіёз на карысьць абодвум бакам. Пакуль ёсьць дыктатар, можна разьлічваць, што дапамога „на падтрымку дэмакратыі” ня спыніцца. Йдзецца зусім не аб сотнях мільёнаў даляраў, але на жыцьцё паасобным запісным „барацьбітам з рэжымам” хапае. Наўрад ці ў выпадку дэмакратычных пераменаў яны здолеюць уладкавацца лепш, чым цяпер. Дык за што змагацца?”

## *ЧЭРВЕНЬ-2002*

■ Кіраўнік прадстаўніцтва Сусьветнага банку ў Беларусі Сяргей Кулік заявіў на прэс-канфэрэнцыі ў Менску 4 чэрвеня, што „за 10 гадоў членства ў Сусьветным банку наша краіна атрымала крэдытаў на суму 170 млн. даляраў, тады як партфель Украіны склаў 3,3 млрд. даляраў, а Расеі — каля 13 млрд.

■ Антыбеларуская палітыка рэжыму, пастаяннае адхіленьне ад вырашэньня насьпелых праблемаў, адмова ад рэформаў, злоўжываньне адміністрацыйнымі рычагамі, самаізаляцыя ад зьнешніх інвэстыцыяў прывялі амаль да поўнай ліквідацыі рэзэрваў для падтрыманьня вытворчасьці і даходаў насельніцтва. У сярэднім па краіне асноўныя фонды апынуліся зношанымі на **80%** і ўзровень зношанасьці з-за адсутнасьці інвэстыцыяў штогод павялічваецца на **3%**. У паловы прадпрыемстваў абаротны капітал поўнасьцю „праедзены”, а яшчэ ў трэці — зьнізіўся да **15-20%** ад мінімальнай патрэбы. Зарэгістравана **4002** стратных прадпрыемстваў, альбо **34%** ад іх агульнай колькасьці. На пачатак мінулага году стратныя прадпрыемствы склалі **22,3%**”.

■ ***Аляксандр Старыкевіч***, вядомы сярод іншага сваёй забойчай ironіяй, выдаў на пачатку чэрвеня яшчэ адзін дыягназ стану справаў у Беларусі: „Бізнэс аказаўся ў стане прыстасавацца нават да цяперашняй улады, чые бальшавіцкія замашкі агульнавядомыя. Парадаксальны факт: паводле апытаньня незалежнага інстытута сацыяльна-эканамічных і палітычных дасьледваньняў агульнанацыянальны рэйтынг Лукашэнкі за апошнія паўгады ўпаў з 45 да 30%, але ў той жа час яго ная папулярнасьць сярод забясьпечанай часткі насельніцтва трошкі вырасла. Вось вам і Робін Гуд на службе ў шэрыфа. Створаная вычварная сістэма грамадзкіх ўзаемадачыненьняў — кепская, няёмкая, але яна стала прывычнай. Прадпрымальнік Валеры Кругавы, які эміграваў у Польшчу і адкрыў там свой бізнэс, сказаў: „Прадпрымальніцкі досьвед, які я набыў у Беларусі, для Польшчы не надаецца. Як і для іншай нармальнай рыначнай эўрапейскай краіны. Іншая канкурэнцыя, іншыя спосабы зарабляць грошы — сітуацыя ў цэлым супрацьлеглая беларускай”.



*Працэсія. Пахаваньне Быкава.*

■ Звычайна ў Менск не прыязджаюць прэзыдэнты цывілізаваных краінаў. У Арменіі вельмі старажытная цывілізацыя, але цяперашняя халопская арыентацыя на Расею вымушае да пэўных сымвалічных крокаў. І нават прэзыдэнт такой краіны Робэрт Качаран, прыехаўшы ў Менск 6 чэрвеня, зрабіў выразныя заявы: „Ідэя далучэньня да саюза Беларусі і Расеі неадназначна ўспрымаецца ў армянскім грамадзтве. У асноўным прыхільнікі гэтай ідэі — кампартыя Арменіі. Гэтая ідэя ў Арменіі папулярнасьцю не карыстаецца.”

■ У Беларусі адзначаны рост злачынстваў, зьвязаных з незаконным абаротам наркотыкаў. За чатыры месяцы сёлета па гэтай лініі было выяўлена **1818** злачынстваў, а за аналягічны пэрыяд летась — **1125**. Найбольш высокія тэмпы росту на Гомельшчыне — на **47,7%**.

■ Як вядома, гуляючыся з Лукашэнкам у „дэмакратызацыю і чатыры ўмовы прызнаньня”, АБСЭ загнала сябе ў тупік. Наконт фактычнай высылкі з краіны прадстаўніка КНГ АБСЭ Э. *Карпэнцера* амбасада Вялікай Брытаніі 6 чэрвеня распаўсюдзіла адмысловую заяву Эўразьвязу. У заяве гаворыцца ня толькі пра няўдзячны рэжым Лукашэнкі. Ёсьць у ёй таксама элемэнты замілаванага саманазіраньня і лісьлівыя самаацэнкі. Так, падкрэсьлена „надзвычайная важнасьць ролі АБСЭ ў дэмакратычнай кансалідацыі Беларусі і яе эканамічнага і сацыяльнага прагрэсу”. Вось так, а мы і ня ведалі, каму дзячыць за сваё незаслужанае шчасьце. Можна прыйсьці да высновы, што настаў час накіраваць групу псіхіятраў з Навінак у Брусэль для аналізу неадэкватных паводзінаў эўрапалітыкаў ды іхнага трызьненьня.

■ *Бел-Чырвона-Белы Сьцяг*, вывешаны падчас маладзёвай акцыі „Беларусь у Эўропу!” над дахам рэдакцыі газэты „Вячэрні Мінск” у Мнску 14 траўня, трымаўся там **21** дзень.

***Валеры БУЙВАЛ***

Беларускія Ведамасьці

Беларускае выданьне

У супрацоўніцтве зь Беларускім Выдавецкім Таварыствам ў Амэрыцы

**Рэдакцыя: Зянон Пазьняк, Галіна Палачаніна**

**Адрас рэдакцыі: 02-017 Warszawa, Al. Jerozolimskie 125/127**

**тэл./факс: (+48 22) 628 76 73**